Пролетарыі усіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 21 (299) | Аўторак, 17 верасня 1957 года | Цана 20 кап.

Заглянем у будучыню

Марозная раніца 1959 года. Снег паскрыпвае пад нагамі паспешлівых пешаходаў. Спяшаецца на завод рабочы. На хаду перажоўваючы снеданне, паглядвае на гадзіннік студэнт. Працоўным рытмам сустракае Мінск наступленне новага дня.

...Насупраць велічнага будынка Дома Урада—строгія лініі галоўнага корпуса БДУ. Правае крыло яго прыпаднята на спіне гіганцкага акведука.

Гудзе шматгалосы муравейнік. У прасторным вестыбюле сустрэліся двое:

— У цябе дзе будуць лекцыі, Лена?

— Наверсе, у планетарыі. А у цябе, Сяргей?

— Мне пад зямлю—у лабараторыю атамнай фізікі.

Гэта што—фантазія? Не. Калі жадаеце, гэта—мара, але мара рэальная, ажыццявімая. Гэта мара і наша, студэнцкая, і мара архітэктара А. Г. Духана, які і стварыў праект галоўнага корпуса БДУ.

— Мара пачне станавіцца былью ужо у гэтым годзе, — гаворыць Абрам Рыгоравіч Духан. — На будаўніцтва галоўнага корпуса універсітэта, якое пачнецца восенню, і яго абсталяванне будзе затрачана каля 24 мільёнаў рублёў. Тут будуць гаспадарнічаць фізіка-матэматычны факультэт, грамадска-палітычныя кафедры, кафедры спецпадрыхтоўкі, фізвыхаванне і спорту.

Вялікая бібліятэка з кнігасховішчам на поўмільёна тамоў будзе абслугоўваць некалькі чытальных залаў—для студэнтаў малодшых курсаў, старшых курсаў і выкладчыкаў.

Легка уздыхнуць і задаволена патруць рукі работнікі кафедры фізічнага выхавання. Кафедра атрымае спортзал на 454 квадратных метраў з вялізнай раздзявальняй, душам і умывальнікам. Будзе дзе рыхтаваць новыя рэкорды!

Больш 1000 чалавек будзе умяшчаць актавы зал. Гэтаму пазайздросціць нават політэхнікі.

Агульны аб'ём памяшканняў галоўнага корпуса—70 000 кубічных метраў.

На IV курсе біялагічнага факультэта ідзе вялікі практыкум па тэме «Фізіялогія сэрца беспазванковых».

НА ЗДЫМКУ: Галіна Ластоўчэнка і Валянціна Гардзей робяць запіс работы сэрца вінаграднай уліткі.

Студэнцкае жыццё пачынаецца

Прыветліва расчыніліся дзверы фізмата перад 175 першакурснікамі. Яны прыйшлі на свой першы сход. Тут іх сустрэлі старэйшыя таварышы—студэнты, аспіранты, выкладчыкі. На гэтым сходзе першакурснікі пакуль што кратка пазнаёміліся з жыццём універсітэта, выслухалі парады старшых таварышоў: з першых-жа дзён сур'ёзна узяцца за вучобу, каб не запускаць матэрыял, не абмяжоўвацца толькі лекцыямі, а рэгулярна вывучаць падручнікі, карыстацца дапаможнікамі.

175 чалавек—калектыў даволі вялікі. Усе гэтыя таварышы прыйшлі у БДУ з гарачым жаданнем вучыцца на фізіка-матэматычным факультэце. Гэта і адчуваецца з першых дзён навучальнага года. Усе адразу уключыліся не толькі ў вучобу, але і ў комсамольскае, грамадскае, спартыунае жыццё універсітэта.

...У калідорах цішыня. Ідуць заняткі. Але вось раздаецца званок, і шумны усхваляваны натоуп першакурснікаў бяжыць з адной аудыторыі ў другую. І як не быць узбуджаным, калі слухаеш свае першыя студэнцкія лекцыі! Столькі ўражанняў ад універсітэта, ад лекцый, новых таварышоў і новых выкладчыкаў! Усё яшчэ жыва абмяркоўваюцца праведзеныя па групах комсамольскія выбарчыя сходы.

— А у нас ужо былі практычныя заняткі па матэматычнаму аналізу. Вельмі цікава. Мы чарцілі,—радасна зяюючы вачыма гаворыць высокая смуглая дзяўчына.

Канчаюцца лекцыі, і кожны ўжо па-студэнцку размяркоўвае свой вольны час. Адных можна застаць у чытальнай зале, дзе яны, не губляючы часу, рыхтуюцца да будучых семінарскіх заняткаў па гісторыі КПСС. Другія захапіліся мастацкай самадзейнасцю. Ну, а прыхільнікі спорту, вядома, на спартыуных пляцоуках.

Між іншым, першы курс фізмата даў значнае папауненне нашаму спартыунаму клубу: 14 чалавек-разраднікаў і 21—маючых першую і другую ступень ГТА. Некаторыя з іх залічаны членамі або кандыдатамі у зборныя каманды. Так, Фёдарау, які мае першы юнацкі разрад па фехтаванню, стаў членам зборнай каманды. Меняшкіна і Каліноуская залічаны у зборную каманду па валейболу як кандыдаты. Чарнецкая мае другі разрад па плаванню і запісалася у секцыю плавання.

На факультэце ужо арганізаваны баскетбольныя каманды першага курса фізікаў і матэматыкаў. 6 верасня была праведзена сустрэча гэтых каманд. Плануецца сустрэча па баскетболу зборнай каманды першага курса фізмата з хімікамі. Пачаліся рэгулярныя трэніроукі баскетбольных жаночых каманд і валейбольных жаночых і мужчынскіх каманд.

Але гэта толькі пачатак. Колькі цікавых і адказных спрау наперадзе!

Н. ЛЕЎДАНСКАЯ,
С. АНЦІПЕНКА.

НА ЗДЫМКУ: Ада Харытанович, студэнтка IV курса хімічнага факультэта, схілілася над дыэлькаметрам. На лабараторным занятку яна атрымала заданне — вызначыць дыэлектрычную пастаянную рызіны.

НА ФАКУЛЬТЭТАХ

ПАСЕДЖАННІ КАФЕДР

Днямі адбылося паседжанні кафедр фізічнай і эканамічнай геаграфіі, на якіх былі зацверджаны планы работ на першы семестр і мерапрыемствы па падрыхтоўцы да 40-годдзя Вялікага Кастрычніка. На геафаку арганізуюцца дзве выстаўкі: «Дасягненні совецкай геалогіі ў вывучэнні багацяў СССР і БССР за 40 год» і «Народная гаспадарка БССР да слаунага юбілею 40-годдзя Вялікага Кастрычніка».

Прайшлі паседжанні на кафедрах філалагічнага факультэта. Зацверджана тэматыка дакладаў на юбілейных навуковых сесіях, прысвечаных Кастрычніку, тэматыка дыпломных і курсавых работ.

Паседжанні кафедр праходзілі і на іншых факультэтах.

У ПЯЦІКУРСНІКАЎ

На працягу двух месяцаў студэнты 5-га курса аддзялення геаграфіі працуюць у раёнах Гомельскай і Маладзечанскай вобласцей. Тут яны вывучаюць прыродныя умовы, рэсурсы, гаспадарку. Сабраныя матэрыялы з'явяцца грунтоўным матэрыялам для напісання дыпломных работ.

Праддыпломную вытворчую практыку студэнты-геолагі праходзяць на Урале, Заходняй Сібіры, Казахстане.

На вытворчай практыцы знаходзяцца зараз і студэнты-дыпломнікі іншых факультэтаў. Біёлагі ужо паўтара месяца праходзяць практыку ў школах, журналісты працуюць у раённых, гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх газетах, студэнты фізмата—на заводах краіны.

ПІСЬМЫ

З ЦАЛІННЫХ ЗЯМЕЛЬ

Гарачае прывітанне, таварышы студэнты!

У Калінінскім раёне Акмолінскай вобласці працуюць 462 студэнты нашага універсітэта. Раён у асноўным абжыты і для Казахстана густа населены. Жывуць студэнты ва ўпарадкаваных памяшканнях. Студэнты III курса аддзялення матэматыкі нават крыўдзяцца, што іх пазбавілі такой рамантыкі, як жыццё ў палатках.

На наступных старонках

ЧЫТАЙЦЕ:

Вынікі мінулага навучальнага года

*

Студэнты на калгасных палях

*

На возеры Нарач

*

Навіны навукі і тэхнікі

У мінулым месяцы студэнты працавалі на загатоўцы сена, сіласаванні, будаўніцтве і г. д. Вельмі добра папрацавалі на будаўніцтве жылых дамоў, загатоўцы самана, рамонце памяшканняў для ската студэнты юрыдычнага і біялагічнага факультэтаў. Дзённыя нормы яны выконвалі на 200—300 працэнтаў. Студэнты III курса аддзялення фізікі пабудавалі ў сяле Коскуль новы скотны двор, некалькі жылых дамоў. Спецыяльнасці ўкладчыкаў саману, тынкоўшчыкаў асвоіла большасць нашых студэнтаў, у тым ліку і дзяўчаты.

Аб уборцы ураджаю многа напісаць не можам, яна толькі яшчэ пачынаецца. У асноўным прыдзецца працаваць на таках; працаваць будзе цяжка, таму што дажджы, якія ішлі на працягу ўсяго месяца, прывялі да нераўнамернага выспявання хлябоў. Прадстаіць вялікая работа па прасушцы зерня. Але працаваць будзем столькі, колькі спатрэбіцца.

Н. РОЖЫН.

НАШЫ СПРАВЫ

Студэнтам, напэўна, цікава было-б даведацца аб справах сваіх сяброў, якія працуюць зараз на цалінных землях Казахстана.

Расказаць аб нашым жыцці, аб нашай працы можна многа, але на гэта будзе свой час. Пакуль што паведамляем, што жывем дружна, весела, працуем добра, а настрой ва усіх самы бадзёры. Можам пахваліцца, што за гэты месяц мы авалодалі прафесіямі маляра, тынкоўшчыка, будаўніка і інш. Зараз мы сваімі рукамі змаглі-б збудаваць новы будынак універсітэта! А нашы хлопцы! Яны зусім малайцы—майстры на ўсе рукі!

Студэнты нашай брыгады не толькі добра працуюць. Яны падрыхтавалі канцэрт мастацкай самадзейнасці, цёпла сустрэты гледачамі. Асабліва вялікім поспехам карысталіся беларускія народныя песні, памайстэрску выкананыя студэнтамі III і IV курсаў аддзялення беларускай мовы і літаратуры.

Наперадзе ў нас многа вялікіх спраў. Але мы будзем працаваць так, каб прынесці як мага больш карысці любімай Радзіме!

Л. СЕЎРУК,
ад імя студэнтаў II брыгады філалагічнага факультэта.

Звярніце на іх увагу!

АМАТАРЫ ЛЁГКІХ ШЛЯХОЎ

Прозвішча не паведаміў: відаць, дужа скромны.

Сэрца-ж не камень. Бываюць выпадкі, што яно пачынае даваць перабоі, асабліва пасля вялікіх нервовых узрушэнняў. Такім узрушэннем для Алы Міхайлоўскай з'явілася вестка аб тым, што іх курс едзе у калгас. Раптам яна адчула моцнае недамаганне. З'явіўшыся ва універсітэцкі медпункт, Ала заявіла урачу, што яе сэрца не вытрымае чатырох тыдняў жыцця ў вёсцы, і яна вельмі жадае па прычыне сардэчнай слабасці застацца у Мінску.

Цэлую гадзіну Ала дабівалася, каб яе прызналі хворай і далі адпаведную спраўку. Але, як гаворыцца, справа «прагарэла», і Ала, абураная і незадаволеная, пакінула медпункт.

Прайшоў дзень. І вось Ала зноў у пакоі медпункта.

— Я не сказала ўчора, што у мяне расцяжэнне звязак пазваночніка. Урач, у якога я лячылася, не дазваляе ехаць у калгас. Вось гісторыя маёй хваробы, і Ала кладзе на стол невялічкую кніжачку.

Наколькі нам вядома, нікому не дазваляецца выносіць гісторыю хваробы за сцены лячэбнай установы. Больш таго, ні адзін урач не мае права выдаваць хвораму гэты дакумент. Але урач Алы аказаўся занадта добрым. Аднак і гэта не дапамагло. Спраўкі Але не выдалі, бо расцяжэнне звязак у яе было... у мінулым годзе.

Мы сфатаграфавалі студэнтку III курса фізмата Алу Міхайлоўскую ў пакоі медпункта. Калі у Міхайлоускай запыталі імя, яна зрабіла артыстычны абарот галавой і падкрэслена ветліва прамовіла:

— Ала Васільеўна.

Нядаўна мы даведаліся, што Ала Васільеўна яшчэ раз з грудай паперак прыходзіла ў медпункт. Аднак і на гэты раз справа... «прагарэла».

Ала МІХАЙЛОЎСКАЯ пытаецца даказаць, што яна хворая...

Нельга дзяўчыне выязджаць з Мінска—і ўсе тут. Нават у спраўцы з лечкаміссіі пацвярджаецца гэта, праўда, другімі словамі. Студэнтка Э. Золава упэўнена глядзіць на невялікую паперку, у якой заключаны ўсе яе надзеі. Аднак паперка,

Тацяна ГУТМАН, (крайняя справа) у прыёмнай медпункта.

відаць, дадзена вельмі шчодрай рукой. Універсітэцкі урач запэўняе Золаву, што лёгкая фізічная праца на свежым паветры ёй не пашкодзіць.

— Якое гора, трэба будзе ехаць,—Золава ледзь не плача.

Такому дужаму хлопцу соромна увільваць ад працы.

...Студэнтка III курса фізіка - матэматычнага факультэта Тацяна Гутман безапеляцыйна заявіла:

— Калі-б мама не паехала адпачываць, а была тут, я бы абавязкова засталася ў Мінску.

Мама Тацяны працуе у паліклініцы МУС. Як гаворыцца, каментары не патрэбны.

Студэнту, якога вы бачыце на гэтым здымку, вельмі не хацелася ехаць у калгас. Аднак, даведаўшыся, што танзіліт не можа абараніць яго ад фізічнай працы, хлапец паспешна павярнуў да дзвярэй і выляцеў з медпункта. Прозвішча не паведаміў: відаць дужа скромны.

А гэты малады чалавек, што так пагражальна глядзіць у аб'ектыў апарата, спасылаўся на слабасць зроку. Урачы-ж рашылі, што праца на лоне прыроды пойдзе яму толькі на карысць.

Многа людзей перабывала перад ад'ездам у калгасы ў невялікім памяшканні універсітэцкага медпункта. І сярод іх было нямала такіх, якія імкнуліся любымі сродкамі дабіцца вызвалення ад працы. Дзіўна, што шлях у калгас для некаторых студэнтаў ляжыць праз медпункт. Гэта вельмі нездаровая з'ява.

Студэнцкія арганізацыі павінны па-сапраўднаму заняцца сустракаючайся ў многіх маладых людзей хваробай — жаданнем увільнуць ад працы.

О. СЦЕПАНЕНКА.
Фота П. МІХАЙЛАВА.

АГЛЯД ДРУКУ

Першы нумар насценнай газеты

Першы нумар факультэцкай насценнай газеты фізіка-матэматычнага факультэта «За навуку» прысвечан пачатку новага навучальнага года. Пад шапкай «Займацца на фізмаце—вялікі гонар» рэдкалегія змясціла справаздачу аб сходзе у гонар новага навучальнага года і выступленні прадстаўнікоу новага папаўнення факультэта.

Жыва зроблена справаздача аб сходзе. Студэнты В. Гракаў (III курс), М. Неменман і А. Межэнь (V курс), якія падрыхтавалі матэрыял, умела выбралі галоўнае, зрабілі цікавыя падзагалоукі.

Першакурснікі ў заметках, змешчаных у газеце, гавораць аб тым, што іх мара здзейснілася, і што яны абяцаюць апраўдаць надзеі выкладчыкаў, старшых таварышоу.

Пад той-жа шапкай змешчаны дзве віншавальныя тэлеграмы, пасланыя старшакурснікамі, якія зараз працуюць на цаліне.

У газеце расказваецца аб тым, як правялі свой адпачынак студэнты факультэта. Звыш 30 чалавек атрымалі пуцёўкі у прафкоме, студэнтка IV курса М. Цішкевіч дзеліцца сваімі уражаннямі аб паездцы па Закаўказзю. Аб незабыўных днях свята маладосці і дружбы расказвае удзельнік універсітэцкага хору студэнт V курса П. Чарнуха ў заметцы пад назвай «На VI Сусветным».

У цэлым нумар зроблен добра. Апавяданні П. Чарнухі і М. Цішкевіч ілюструюцца фотаздымкамі аутарау. Амаль усе заметкі нанісаны літаратурнай мовай.

Большасць факультэтаў марудзяць з выпускам газет. Напрыклад, няма газет на філалагічным, біялагічным і іншых факультэтах.

Сямён БЛАТУН.

У ПАХОДЗЕ

Гарністы, помню, клікалі
у дарогу...
Пот гімнасцёрку клеіу
да спіны,
А я ішоу, хаця прасілі ногі:
«Прысядзь, хоць на хвілінку,
адпачні».
Хацелася ад стомы скінуць
боты,
Ступіць на росы босаю
нагой,
Ды толькі ногі я запэуніу:
потым
Мы адпачнем, як скончыцца
паход.
Дамоу вярнууся.
У полі за работай
Ізноу бягуць напружаныя
дні.
І тут я ногі суцяшаю—потым,
Калі яны заныюць: «Адпачні».

Па слядах нашых выступленняў

„А ВОЗ—НІ З МЕСЦА"

Пад такім загалоўкам у № 18 нашай газеты быў змешчан матэрыял аб нездавальняючай рабоце студэнцкай сталовай.

Старшыня прафкома універсітэта Д. Марчанка паведаміў рэдакцыі, што артыкул абмяркоўваўся на пасяджанні прафкома. Былі прыняты меры па ліквідацыі недахопаў у рабоце сталовай. Зараз закончан рамонт сталовай. У сталовай устаноўлена электрычная печ. Будуць прымацца усе меры, каб задаволіць студэнтау.

Сярод залічаных на біялагічны факультэт нямала медалістаў: у тым ліку Галя Жывула, Ніна Жэлнеровіч, Святлана Мохарава, Сцяпан Самусевіч. ↓

ВЫНІКІ МІНУЛАГА НАВУЧА

Выконваючы гістарычныя рашэнні XX з'езду КПСС, калектыу нашага універсітэта дабіуся у 1956/1957 навучальным годзе значных поспехаў у пастаноуцы вучэбнай, палітыка-выхаваучай і навуковай работы.

Яшчэ у пачатку мінулага навучальнага года Вучоны совет, рэктарат, дэканаты і кафедры універсітэта падрабязна абмеркавалі на сваіх пасяджаннях усе пытанні, звязаныя з правядзеннем усіх відау вучэбнай работы. Былі перагледжаны напрамак і змест вучэбна-метадычнай, навуковай і палітыка-выхаваучай работы, намечаны мерапрыемствы па паляпшэнню усёй работы універсітэта.

Асаблівая увага была удзелена пытанню далейшага павышэння ідэйна-тэарэтычнага узроуню лекцый, семінарскіх і практычных заняткаў, пашырэнню сувязі выкладаемых дысцыплін з практыкай соцыялістычнага будаўніцтва, выкарыстанню у выкладанні навейшых дасягненняу навукі і тэхнікі.

Навукова-даследчая праца праводзілася у плане вырашэння актуальных тэарэтычных і практычных задач, цесна звязаных з запатрабаваннямі далейшага развіцця народнай гаспадаркі і культуры БССР.

У сувязі з тым, што у мінулым навучальным годзе заняткі пачаліся ў канцы кастрычніка, вучэбны план па універсітэту выканан на 98,7 працэнтау.

Трэба адзначыць, што у справаздачным годзе кабінеты і бібліятэка універсітэта папоунілися у значнай меры вучэбнай і навуковай літаратурай. Аднак па цэламу раду курсау яшчэ няма падручнікау, частка вучэбнай літаратуры устарэла. У кабінетах некаторых факультэтау (хімічным, геаграфічным, біялагічным) нехапае рэкамендаваных падручнікау, справачнай літаратуры.

Вялікае месца у вучэбнай рабоце універсітэта займалі пытанні, звязаныя з арганізацыяй кантролю за якасцю чытаемых лекцый, правядзеннем лабараторных і практычных заняткау, арганізацыяй самастойнай работы студэнтау. У арганізацыі кантролю за правядзеннем вучэбных заняткау добра наладзілі справу кафедры гісторыі КПСС, дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма, палітычнай эканоміі, эканамічнай геаграфіі, зарубежнай літаратуры, грамадзянскага права і працэсу і іншыя. Вялікую увагу удзялілі гэтаму пытанню дэканы факультэтау П. Г. Пятровіч (біяфак), І. Г. Цішчанка (хімфак), П. З. Савачкін (гістфак).

Кантроль за якасцю выкладання ажыццяўляўся рознымі шляхам стэнаграфаванне лекцый, наве ванне лекцый дэканамі, загадчы мі кафедр, узаемнаведванне ле цый выкладчыкамі, запіс асобн лекцый на магнітафон, папяр няе абмеркаванне лекцый на седжаннях кафедр, правядзе адкрытых лекцый і г. д.

Асноуная маса прафесарска кладчыцкага складу БДУ чы лекцыі і праводзіць практычн і лабараторныя заняткі на вы кім ідэйна-палітычным і нау вым узроуні. Аднак ва универ тэце мелі месца выпадкі, к асобныя выкладчыкі чыталі л цыі і праводзілі іншыя віды чэбнай работы на недастатко навуковым і метадычным узр ні. Ёсць недахопы і у арганіза кантролю за якасцю вучэбных няткау. Яны выражаюцца у т што кантроль ажыццяўляуся канамі факультэтау і загадчы мі кафедр не сістэматычна, пыт работы лепшых кафедр і фесарска-выкладчыцкага скл яшчэ слаба абагульняуся і не навіуся дасягненнем усяго ка тыву БДУ.

У мінулым навучальным г была удзелена вялікая ува ганізацыі самастойнай працы дэнтау. З мэтай высвабад

ных студэнтам з боку выкладчыкаў, але і аб тым, што некаторыя кафедры слаба арганізавалі самастойную працу са студэнтамі, мала аказвалі ім штодзённай дапамогі над вывучэннем адпа-

На калгасных палях Мінскага раёна

ПЕРШЫЯ ПОСПЕХІ
(або бульбяныя замалёўкі)

Матацыкл чыхнуу апошні раз, і мы апынулiся у калгасе імя Войкава. Тут працуюць студэнты I і II курсаў геаграфічнага факультэта.

...Першакурснікі збіраюць хмель. Справа гэта даволі складаная, з ёй нашым студэнтам не даводзілася ніколі сутыкацца. Але ужо першая сустрэча закончылася іх перамогай.

Сёлета праўленне калгаса не выдзяліла спецыяльных людзей на гэтую справу. На полі працуюць толькі студэнты і школьнікі.

...Асабліва ажыулена каля вясоу. Стары хмелявод Ю. Журок доуга і прыдзірліва важыць хмель. А потым, таксама доуга, корпаецца у сваім блакноціку, запісваючы вагу. Нецярплівыя дзяучаты заглядваюць з-за пляча.

— Сем кілограмаў! На сем кілограмаў перавыканалі норму,—радасна гаворыць адна з іх. Гэта Валя Чэрнышова—«камандзір» шумлівага звяна. А учора толькі тры кілограмы было звыш нормы.

Вядома, не ўсё так гладка. І часам бравы Ю. Журок нахмураны. Але поспехі ёсць, і гэта галоўнае .

Кіраунік групы тав. Лукошка расказвае, што працуюць і жывуць студэнты нядрэнна. Арганізавалі разам з другім курсам сумеснае харчаванне—у сталовай торфапрадпрыемства. Свае кашавары рыхтуюць цудоуную ежу.

...У свірне мы засталі у самых маляунічых позах студэнтак II курса. Яны часова адпачывалі.

— Не сумуеце, дзяўчаты?—Што вы, у нас-жа такая машына,—яны ківаюць галовамі у бок веялкі. — Пакруціш — адразу весела стане.

...Каля другога свірна мы убачылі машыну з зярном, якую зараз разгружалі студэнты. Кіраунік групы выкладчык В. Я. Крышчановіч расказаў:

— Нас тут 17 чалавек. Працуем, здаецца, добра. Ва усякім выпадку скаргаў няма. Вось цяпер выконваем нават не сваю работу,—ён паказвае на машыну і растлумачвае. —Гэтая машына ад камбайна. Там працуюць студэнты юрыдычнага факультэта, і яны павінны прысылаць сваіх грузчыкаў. Але вось іх няма і таму мы, каб не затрымліваць камбайн, рашылі самі разгрузіць.

...Калі мы ужо ад'язджалі, нам науздагон неслiся воклічы: «Прывітанне Мінску, універсітэту!»

В. МАШКОЎ.

ПРАЦУЮЦЬ ДОБРА

Мы наведалі сельгасарцель «Перамога». Тут працуюць студэнты III і IV курсаў аддзялення фізікі. Прайшло зусім мала часу, а у калгаснікаў ужо склаліся самыя добрыя думкі аб сваіх памочніках.

Студэнты выконваюць розныя работы: працуюць у амбары, сіласуюць, убіраюць бульбу. І усюды спрауляюцца добра.

Мы звярнулiся да кірауніка групы студэнтаў, якія працуюць у першай брыгадзе, што знаходзіцца у Калодзішчах, з просьбай назваць лепшых студэнтаў.

— Гэта вельмі цяжка, — адказаў Васілій Іосіфавіч Кузьміч,—усе працуюць добра: і Віктар Шапіла, і Леанід Мінько, і Аляксандр Шылау і многія другія. А наогул пра хлопцаў калгаснікі адзываюцца лепш, чым пра дзяучат.

— Лепшых памочнікаў і жадаць не трэба,— сказау пра студэнтаў брыгадзір другой брыгады Нікалай Хмяльніцкі.

Кіраунік групы студэнтаў, якія працуюць у гэтай брыгадзе, Раіса Наумауна Кауфман, паказала нам працоуныя кніжкі, якія заведзены на кожнага студэнта. Яны пакуль што чыстыя, але праз кожныя пяць дзён брыгадзір будзе рабіць у іх сваю адзнаку.

— У канцы усёй работы у калгасе мы падвядзем агульныя вынікі,— сказала Раіса Наумауна. — Спадзяемся, што яны будуць добрыя.

І. ШУЦІК.

„Убярэм бульбу да адзінага клубня!"

Ніна ЗЮЗІНА

На калгасных палях за раз гарачая пара — ідзе уборка бульбы. Кожны, хто даражыць інтарэсамі роднай краіны, імкнецца унесці свой уклад у гэтую справу.

Сярод першакурснікаў з першых дзён работы добра сябе зарэкамендавала Ніна Зюзіна. Якую-б справу не даручылі Ніне, яна заўсёды выконвае яе хутка і акуратна. У апошнія дні яна, як і усе яе сяброўкі, прыступила да уборкі бульбы. Карыстаючыся добрым надвор'ем, дзяўчаты працуюць ад раніцы да позняга вечара.

— Працаваць так, каб ні адзін клубень не застаўся ў полі!—пад такім лозунгам працуюць Ніна Зюзіна і яе сяброўкі—аднакурсніцы з першага гістфака.

Памочнікі—працавітыя

Раніца выдалася прыгожая, сонечная. Вёска Замасточча павольна прабуджалася ад сна. Яшчэ трымауся у павятры начны халадок і травы блішчэлі ад дажджу, які прайшоу перад світаннем, але па усяму адчувалася, што дзень будзе цёплым.

У восем гадзін раніцы ля калгаснага свірна, як звычайна, сабраліся усе пятнаццаць дзяучат-першакурсніц, якія працуюць у вёсцы. Не прыйшлі толькі хлопцы—Мікалай Баравік, Міхаіл Мяцельскі, Антон Лысюк і Пётр Валкавец. Ноччу ім давялося нагружаць і разгружаць машыны, якія адвозілі збожжа у горад. І цяпер, напэўна, хлопцы бачаць свае першыя сны.

Кіраунік групы—студэнт IV курса філалагічнага факультэта Аляксандр Старавойтау—раздае нарад на работу. Пачынаецца звычайны працоуны дзень.

Старавойтау яшчэ не ведае прозвішча і імя усіх студэнтак, але ён ужо можа сказаць, як кожная з іх працуе.

— Увогуле нашы студэнты ад работы не бегаюць, робяць усё як трэба,—гаворыць ён.

І сапрауды, працуюць тут добра. Да позняга вечара чуваць грукат веялкі, якую абслугоуваюць дзяучаты. У той час як адна група праветрывае зерне, другая працуе на уборцы гародніны.

Дзяучаты ніколі не адмауляюцца нават ад самай цяжкай працы, часта удзельнічаюць у пагрузцы збожжа. Характэрна, што самымі лепшымі у працы аказаліся тыя, у каго за плячыма некалькі год самастойнага жыцця, некалькі год работы.

Даша Долгая працавала настаўніцай у вясковай школе на Гомельшчыне, а Вера Хомчык—бухгалтарам сярэдняй школы у Слоніме. З першых дзён работы у калгасе яны зарэкамендавалі сябе як добрасумленныя, працавітыя дзяучаты.

У суседняй вёсцы Дворэц працуе 28 першакурснікаў. Кіраунік групы І. А. Карабань задаволен работай студэнтау. Асабліва добра адзываецца ён аб Э. Кандзерскім і Л. Лопухе. Абодва яны паступілі ва універсітэт з рэдакцый раённых газет.

Наогул, усе 109 студэнтау першага курса філалагічнага факультэта, якія размешчаны у калгасе «Комінтэрн», у першыя-ж дні работы паказалі сябе з лепшага боку.

Прыемна адчуваць, што да нас прыйшлі пасапраўднаму працавітыя, знаёмыя з жыццём людзі.

О. СЦЕПАНЕНКА.

У ПЕРШАКУРСНІКАЎ ГІСТФАКА

— Навошта мы так рана адпрауляемся у калгас,—пагаварывалі некаторыя першакурснікі гіст фака.—Што мы там будзем рабіць? Бульбу-ж яшчэ не ўбіраюць...

І вось ззаду засталіся вучэбныя карпусы універсітэта, у якіх ім, студэнтам I курса, амаль яшчэ не давялося займацца.

Вера ГУРСКАЯ

...Калгас «Кастрычніцкая рэволюцыя». Спрау тут вельмі многа, ёсць дзе прыкласці свае сілы і уменне. Пакуль уборка бульбы толькі яшчэ пачынаецца, ідуць іншыя палявыя работы. Сумаваць, зразумела, дзяучатам і юнакам не прыходзіцца.

На днях мы пабывалі там, дзе працуюць першакурснікі гістфака, пацікавіліся, як яны працуюць. Аб большасці з іх калгаснікі адклікаюцца выключна сардэчна. Вось што, напрыклад, сказала Марыя Станіславауна Куракевіч:

— Малайцы рэбяты, працуюць ад душы, як для сябе. Дзяучаты таксама стараюцца, а калі у іх што-небудзь атрымоуваецца не так, то прыглядаюцца да старшых. Вось сынок Саша—такі працавіты.

Сынок Саша! ...Гэтай пахвалы заслужыу Аляксандр Міхнёу за сваю добрасумленную працу. На якой бы рабоце ён ні апынуўся — сіласаванні, ачыстцы зярня, уборцы бульбы—усюды ён у ліку перадавых.

Ля склада чуюцца ажыуленыя галасы. Паглядваючы уверх калгаснікі паспешна пераносяць спапы ільну пад страху: ох, гэтыя хмары! Сярод жанчын выдзяляюцца дзве руплівыя дзяучыны. Не памыліш-ся, калі скажаш, што гэта студэнткі. Хто яны, так энергічна працуючыя разам са старэйшымі?

Галя МЯЛЕШЧЫК

Валя ЛАКСЕЕВА

Адна з іх Марыя Ключнікава.

— Былая даярка калгаса імя Жданава Рагачоускага раёна,—усміхаецца дзяучына, падхопліваючы некалькі снапоу.

Аляксандр ВАНЬКЕВІЧ (справа).

— Я таксама прыехала ва універсітэт з калгаса,—гаворыць Ліля Кніга.

Дзяучына паднімае сноп ільну—той нечакана раскідваецца, але Ліля упэунена, з веданнем справы вяжа яго і ідзе далей. Потым, калі мы накіраваліся да камбайна, які працаваў за лесам, зноу міжволі азірнуліся: абедзве дзяучыны—і Ключнікава, і Кніга—працягвалі працаваць неяк лёгка і свабодна, хутка і энергічна.

Камбайн перасякае поле, дзе зусім нядауна стаяла густая грэчка. Вось ён спыняецца ля груды грэчкі і падхоплівае на барабан першую порцыю. Раз за разам ускідвае вілы Аляксандр Ванькевіч, дакладна, без лішніх рухаў выконвае ён сваю справу. Праходзіць адна-дзве мінуты—і вось ужо камбайн рухаецца далей. За ім накіроуваецца Аляксандр Ванькевіч, Раіса Міхневіч і Іван Павядайла—выдатныя падавальшчыкі, як аб іх адклікаюцца механізатары.

А на бульбяным полі асабліва прыкметна, хто і як працуе. Большасць студэнтау імкнуцца ісці «у нагу», убіраюць бульбу чыста і хутка. Хто-ж усё-ж-такі лепш працуе? Вось яны перадавікі уборкі бульбы: Вера Гурская, Галя Мялешчык, Валя Лаксеева. Вера Гурская да паступлення у БДУ працавала у плодапітомніку. Усе палявыя работы ёй добра знаёмы, таму і зараз ёй не цяжка працаваць.

Не уступаюць ёй Галя Мялешчык і Валя Лаксеева. Выйдуць дзяучаты у поле убіраць бульбу—хутка-хутка адзін за другім напауняюцца кошыкі.

Аляксандр МІХНЕЎ

З іх можна браць прыклад, па іх павінны раўняцца астатнія!

Фотарэпартаж М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

ПОСПЕХІ ЛЁГКААТЛЕТАЎ

Заканчваецца спартыунае лета. Яно прынесла новыя перамогі універсітэцкім спартсменам. Значных поспехаў дабіліся нашы лёгкаатлеты. На Другой Усебеларускай спартакіядзе студэнтаў яны у цяжкай і напружанай барацьбе выйшлі на першае месца, перамогшы мацнейшыя спартыуныя калектывы рэспублікі. На гэтых спаборніцтвах выявіліся новыя імёны маладых, да гэтага мала вядомых спартсменаў.

Алег Кузнечык у бегу на 1500 і 5000 метраў і Тамара Сахацкая у бегу на 800 метраў сталі чэмпіёнамі Беларусі сярод студэнтаў і устанавілі новыя рэкорды універсітэта.

Першыя месцы на гэтых спаборніцтвах заваявалі таксама В. Гараеу, Е. Гурвіч, І. Абрамовіч і другія.

З поспехам выступілі нядауна на Усесаюзным чэмпіянаце па лёгкай атлетыцы спартсмены нашага універсітэта Прановіч, Кашалёва, Гурвіч, Гараеу, Лаўрыновіч, якія прымалі удзел у гэтым першынстве у складзе зборнай каманды Беларусі.

Нашы спартсмены зноў упарта трэніруюцца. На стадыёне «Дынамо» кожны дзень можна сустрэць загарэлых юнакоу і дзяучат, якія працягваюць удасканальваць сваё спартыунае майстэрства. Хутка ім прадстаіць сустрэцца са спартсменамі Вільнюскага універсітэта. Гэтая таварыская сустрэча адбудзецца у Вільнюсе, куды каманда БДУ выедзе 27 верасня у складзе 20 чалавек.

А. СІЛЕНКОЎ.

НА ВОЗЕРЫ НАРАЧ

Наурад ці знойдзецца хоць адзін беларус, які не ведае гэтага цудоунага возера з маляунічымі берагамі. Штогод тут у летнія месяцы адпачываюць сотні працоуных Мінска і іншых гародоу. А сёлета, калі на біялагічнай станцыі універсітэта прыбавіуся яшчэ адзін будынак, тут адпачывала многа нашых выкладчыкаў.

Але для нас Нарач цікавы не толькі месцам адпачынку, а галоунае месцам, дзе вядзецца вялікая навукова-даследчая праца.

Адным з першых гэтым летам паявіліся тут студэнты I курса біялагічнага факультэта. Яны на працягу шасці тыдняў праходзілі практыку, а некаторыя з іх—12 чалавек—вырашылі прадоужыць практыку на землях цалінных, падалі калектыуную заяву і паехалі убіраць ураджай у Акмолінскую вобласць.

Акрамя першакурснікаў, тут практыкаваліся студэнты старшых курсаў.

Вось на здымку: малодшы навуковы супрацоунік Аліна Лёшына і студэнткі Клаудзія Прэдкель і Антаніна Навакоуская у лабараторыі даследваюць водныя расліны. На здымку уверсе (злева): домік біялагічнай станцыі БДУ, дзе праводзяцца работы па даследаванню жывёльнага і раслінnага свету вадаёмаў.

Нарачанскі прычал.



У СВЕЦЕ НАВУКІ І ТЭХНІКІ

ВЕЧНАЯ ПАПЕРА

Папера з нейлонавых валокан непараунальна больш трывалая, чым звычайная,—паведамляе французскі часопіс «Ля Нацюр». Тонкі ліст такой бумагі амаль немагчыма разарваць рукамі. Яна не псуецца ад вільгаці і ад уздзеяння большасці хімічных рэактываў, не падвяргаецца шкоданоснаму уплыву святла, мікраарганізмаў і іншых разбуральнікаў звычайнай паперы.

У той-жа час на такой паперы можна пісаць простым алоукам і чарнілам. Яна прыгодна для розных відаў друку.

Нейлонавая папера ужо выпрабляецца і выкарыстоуваецца для асоба важных дакументаў, якія падлягаюць вечнаму захоуванню, для ваенных і асабліва марскіх карт. У далейшым галіны яе ужывання будуць пашырацца.

СЭРЦА ЖЫРАФА

Галава чалавека знаходзіцца у некалькіх дзесятках сантыметрах вышэй сэрца. У жырафа гэтая адлегласць дасягае да трох метраў. Вучоных даўно ужо цікавіу працэс крывазвароту у жырафа. Якім чынам сэрца можа накачваць кроу на вышыню трох метраў?

Праведзеныя даследаванні паказалі, што сэрца жырафа з'яуляецца дзівосным насосам.

Яно важыць каля 12 кілограмаў, таушчыня яго сценак дасягае 8 сантыметрау. Ціск крыві у жырафа у два разы болей, чым у чалавека. Таму няма нічога здзіуляючага у тым, што сэрца можа накачваць кроу нават на трохмятровую вышыню.

УПЕРШЫНЮ Ў СВЕЦЕ—ФАРФОР СА ШКЛА

Румынскія інжынеры Д. Папеску Хаш і Лунгу Стэліан ажыццявілі векавую мару керамікаў усяго свету—яны атрымалі фарфар са шкла.

Прыгатаваныя з шкляного расплаву выдуваннем, прасаваннем або вальцаваннем вырабы падвяргаюцца на працягу двух гадзін спецыяльнай апрацоуцы. У гэты час мае месца малавядомая з'ява—крышталізацыя шкла, дзякуючы чаму выраб набывае структуру, аналагічную фарфору. Працэс вытворчасці працягваецца менш сутак, а каштоунасць фарфору са шкла у 5 разоу ніжэй каштоунасці звычайнага фарфору. Вырабы з новага фарфору могуць быць зроблены у два разы таней, да таго-ж розных колераў і адценняў.

САМЫ ВЯЛІКІ Ў СВЕЦЕ АЎТАПРЫЧЭП

Амерыканская фірма «Мэрыон» пабудавала новы аутапрычэп. Ён дазваляе перавозіць сыпучы груз аб'ёмам да 100 кубаметрау. Вага усяго аутапоезда без груза—каля 50 тон, даужыня—болей 20 метрау.

АРЫГІНАЛЬНЫ РАТАВАЛЬНЫ АПАРАТ

Ва Францыі сканструяван новы ратавальны апарат, прызначаны для верхалазаў. Рабочы прычапляе свой засцерагальны пояс за адыходзячы ад шара стальны канат. Пры выпадковым падзенні прыводзіцца у дзеянне уманціраваны у шар цэнтрабежны тормаз, і чалавек з хуткасцю 2 метры у секунду плауна апускаецца на зямлю.

В. АЎСЕНЕЎ

13 верасня трагічна загінуу ад нящчаснага выпадку студэнт III курса аддзялення фізікі Валодзя Аусенеу.

Цяжка выказаць звычайнымі сухімі словамі, як узрушыла нас гэтая жахлівая падзея. Мы ведалі Валодзю як скромнага чалавека, цудоунага таварыша і выдатнага студэнта. Ён быу узорам ветлівасці, чулых адносін да акружаючых, заусёды роуны, спакойны, уважлівы, надзвычай працалюбівы і настойлівы. Унутраная прыгажосць спалучалася у ім з рашучасцю характара, суцэльнасцю натуры. Мы назаусёды запамятаем яго выключную скромнасць, сумленнасць і праудзівасць нават пры самых звычайных і нязначных абставінах.

Рэдкія асабістыя якасці Валодзі абяцалі зрабіць з яго з часам сапраўднага вучонага. Але трагічная заучасная смерць унесла яго у самым пачатку маладога цудоунага жыцця.

Смерць Валодзі Аусенева—гэта цяжкая страта не толькі для яго бацькоу, але і для усяго калектыву нашага курса, як і для усіх, хто ведаў гэтага цудоунага чалавека. Неперадавальна горка усведамляць нам, што няма больш сярод нас сапраўднага і вернага сябра.

Апошнімі яго словамі былі: «Перадавайце прывітанне усім!» Словы гэтыя, як і увесь яго светлы вобраз, надоўга застануцца у нашых сэрцах. Мы не забудзем цябе, наш дарагі таварыш!

АДНАКУРСНІКІ.

? *Што* каму *снілася* ? ў ноч на 2 верасня !

Першакурсніку—нічога не снілася, таму што ён усю ноч не спаў.

Пяцікурсніку—нічога. Ён спаў спакойна усю ноч.

Прарэктару па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце—што пабудаван новы інтэрнат на 800 месц.

Маладым паэтам БДУ—што выдалі поуны збор іх твораў у 30 тамах.

Членам прыёмнай камісіі—кашмары: ва універсітэт аб'явілі дадатковы прыём студэнтаў.

Членам камітэта комсамола—невядома што ім снілася, таму што яны усё яшчэ спяць непрабудным сном.

ПАДПІСКА

НА ГАЗЕТУ

„БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ“

ПРАВОДЗІЦЦА

прафкомам і мясцкомам БДУ

Кошт падпіскі на 1957/58 навучальны год—9 рублёу.

Таварышы студэнты, выкладчыкі, аспіранты, адміністрацыйныя работнікі, выпісвайце сваю газету!

Адрас рэдакцыі: Мінск.Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19 Рэдактар А. ВОЛК

АТ 01611 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 979 Тыраж 2000